СПАС — ЛЕТА ШАСЬ!

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ, г.Дзяржынск.

Па гарызанталі: 1. «Была б у Мішкі барада,\\То цёк бы ... па барадзе». З верша «Мядзведзь на пасецы» В.Гардзея (19 жніўня пісьменніку спаўняецца 70 год). **3.** ..., Макавей, Мядовік; адна з назваў першага Спаса (14 жніўня), які лічыўся святам мака і мёду. **9.** Тое, што вырашчана, ураджай. **10.** Белы снег, ды не смачны; чорны ..., ды ўсе ядуць (прык.). **11.** Паверхня вадаёма. **12.** Спас — ... шась! (прык.). **14.** Дзе ... — там рада, дзе трое — там здрада (прык.). **18.** Гушкалка, калыханка. **19.** Вулей у выдзеўбанай калодзе. **20.** Жаночае паліто. **21.** Адтуліна ў вуллі для вылету пчол. **23.** Майстар сваёй справы. **24.** Канечная частка чаго-небудзь. **30.** «Калі хочаш доўга жыць і зберагчы ..., абавязкова еш мёд». Авіцэна, урач Сярэднявечча. **32.** Сноп адборнай саломы, якая ідзе на стрэхі. **33.** «Недзе камар ціха струны наладжвае,\\... падала свой пчала, пралятаючы». З верша М.Танка «Канцэрт у сене». **34.** ... або амулет; некалі ў якасці ... выкарыстоўвалі мак: ім абсыпалі магілы, клалі ў чаравік нявесце. **35.** ... на двары без пары таўкуць мак (скорагаворка).

Па вертыкалі: 1. Пчаліная самка, якая выводзіць патомства. **2.** Прылада для акурвання пчол дымам. **4.** Адкос берага ракі. **5.** «Ой, ой, жонка мая, няхай будзе ... твая!\\Няхай так, ці не так, няхай з грэчкі будзе мак!» З беларускай народнай песні «Пасеяў дзед грэчку». **6.** Няправільнасць у дзеяннях, думках. **7.** За пчолкаю — у мёд, за жукам — у ... (прык.). **8.** «Ліпень — з мёдам,\\З пшаніцаю — ...» З верша П.Панчанкі «Родная мова». **13.** Кніга, у якой сабраны малітвы для адпраўлення трэб. **15.** Ігрок, які абараняе вароты ў спартыўных гульнях. **16.** Рады Якаў, што ... з макам (прык.). **17.** Гарадскі пасёлак, чыгуначная станцыя ў Шумілінскім раёне. **20.** Тое, што і медуніца; расліна з дробнымі пахучымі кветкамі. **22.** Адвага або мёд п'е, або ... трэ (прык.). **25.** Пагроза ферзю ў шахматах. **26.** Сад без пчолаў, што ... без вокан (прык.). **27.** Ад першага Спаса — халодныя ... (прык.). **28.** Эпізод у п'есе, рамане. **29.** Лепей ... з вадою, чым пірог і мёд з бядою (прык.). **31.** Прадукт творчай працы.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: 1. Мёд. **3.** Макавей. **9.** Лён. **10.** Мак. **11.** Акваторыя. **12.** Лета. **14.** Двое. **18.** Арэлі. **19.** Борць. **20.** Матро. **21.** Лятук. **23.** Дока. **24.** Край. **30.** Маладосць. **32.** Кулы. **33.** Звон. **34.** Абгарэр. **35.** Камары.

Па вертыкалі: 1. Матка. **2.** Дымар. **4.** Абрыў. **5.** Вогна. **6.** Памылка. **7.** Гной. **8.** Жнівень. **13.** Трэбнік. **15.** Варатар. **16.** Пірог. **17.** Обаяць. **20.** Мядуніка. **22.** Кайданы. **25.** Гарэ. **26.** Хата. **27.** Росы. **28.** Сцена. **29.** Хлеб. **31.** Твор.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.50	20.36	14.46
Віцебск —	5.36	20.30	14.54
Магілёў —	5.40	20.26	14.46
Гомель —	5.41	20.18	14.37
Гродна —	6.06	20.51	14.45
Брэст —	6.11	20.47	14.36

Месяц

Першая квадра 10.08—17.08. Месяц у сузор'і Вадалея.

Імяніны

Пр. *Антона, Ісака, Кузьмы.*
К. *Элеаноры, Сцяпана, Яўхіма.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Адзіная і непаўторная наша **Зінаіда Дрыла**!
З прыгожай датай ад душы віншуем!
Любім, цэнім, паважаем і шануем.
Светлай радасці і міласці нябёс!
Хай анёл ахоўвае твой лёс.
Твая вялікая сям'я.

УСМІХНЕМСЯ

— Давай прыгатуем штонебудзь дыетычнае, але смачнае?

— Напрыклад, парэжам кавун?

Савет ад цёткі Кіры: «Калі не адпускаць мужа піць піва з мужыкамі, то ён пачне піць шампанскае з жанчынамі».

Агарод — гэта тры ў адным: салярый, фітнес, трэнажорная зала.

— Хлопчык, дай на веласіпедзе праехацца, я толькі адзін кружок.

— Добра, а як вас завуць?

— Фёдар Конюхаў-а-а-ааа-ў...

Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

Даты | Падзеі | Людзі

16 ЖНІЎНЯ

1806 год — згодна з рашэннем расійскага імператара Аляксандра I ваенная калегія выдала ўказ аб фарміраванні ў горадзе Мінска мушкецёрскага палка. Складаўся ён з трох батальёнаў. У 1811 годзе быў перайменаваны ў Мінскі пяхотны полк, з 1909 года атрымаў статус 54-га Мінскага пяхотнага Яго Вялікасці цара Балгарскага палка. Яркія старонкі ў гісторыі Мінскага мушкецёрскага палка — вайна 1812 года, Каўказская вайна, гераічная абарона Севастопаля падчас Крымскай вайны, вызваленне Балгарыі ад турэцкага прыгнёту, Руска-японская вайна 1904 — 1905 гг. За доблесць полк адзначаны Георгіеўскім сцягам.

1911 год — 105 гадоў таму нарадзіўся (Жабінкаўскі раён) Андрэй Аляксеевіч Трафімук, савецкі геолаг, акадэмік АН СССР (1958), Герой Сацыялістычнай Працы (1944). З 1953 года працаваў ва Усесаюзным нафтагазавым НДІ (з 1955 года — дырэктар). З 1957 года — дырэктар Інстытута геалогіі і геафізікі Сібірскага аддзялення АН СССР, з 1963-га — член прэзідыума АН СССР. Аўтар больш за 1100 навуковых прац па праблемах фарміравання радовішчаў нафты і газу, павышэння эфектыўнасці пошуку нафты і газаздабычы. Зрабіў значны ўнёсак у падрыхтоўку навуковых кадраў геолагаў-нафтавікоў. Вучоны цікавіўся геалогіяй Беларусі, асабліва становішчам нафтавай геалогіі і нафтаздабываючай прамысловасці. Неаднаразова наведваў Беларусь, кансультаваў многіх вучоных, удзельнічаў у экспедыцыях, прысвечаных разведцы нафты на тэрыторыі Беларусі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1946, 1950), Дзяржаўнай прэміі Расійскай Федэрацыі (1994). Памёр у 1999 годзе.

1941 год — выдадзены Загад Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання «Аб адказнасці ваеннаслужачых за здачу ў палон і пакіданне ворагу зброі», згодна з якім усе савецкія вайскоўцы, якія здаліся ў палон па ўласнай волі, а таксама тыя, хто быў захоплены пры абставінах, якія ад іх не залежалі, аб'яўляліся здраднікамі Радзімы. На падставе гэтага загаду былі распачатыя крымінальныя справы супраць трапіўшых у палон генералаў Уладзіміра Качалава, Паўла Панядзеліна і Мікалая Кірылава, якіх абвінавацілі ў здрадзе Радзіме. Усе яны завочна былі прысуджаны да расстрэлу. Разам з тым, знаходзячыся ў палоне, гэтыя генералы трымаліся мужна і патрыятычна. Іх волю не зламалі ні здзекі, ні абяцанкі фашыстаў. Пасля вайны яны былі вызваленыя заходнімі саюзнікамі і добраахвотна вярнуліся на Радзіму, дзе амаль адразу былі арыштаваныя. У 1950 годзе на падставе таго ж загаду №270 яны былі зноў асуджаныя і расстраляныя. Толькі пасля смерці Сталіна бязвінна пакараных генералаў пасмяротна рэабілітавалі.

1961 год — нарадзіўся Раман Матульскі, педагог, доктар педагагічных навук, прафесар. З 1998 года — дэкан у Беларускім універсітэце культуры і мастацтваў, з 2003-га — дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Аўтар прац «Бібліятэчная справа ў краінах Цэнтральнай і Заходняй Еўропы: арганізацыйна-функцыянальны аспект», «Бібліятэка як сацыяльны інстытут», «Агульнае бібліятэказнаўства».

Было сказана

Максім ТАНК, народны паэт Беларусі:

«Добры чарпак з рэшата,
Ды толькі з яго не піццё!»

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3259.
Нумар падпісаны ў 19.30 15 жніўня 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12